Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па навуковай рабоце БДУКМ
__________В.Р. Языковіч
“13” мая 2019 г.
Рэгістрацыйны № ВД-81а/вуч.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# МІФАЛОГІЯ КІТАЯ І БЕЛАРУСІ: АГУЛЬНАЕ І СПЕЦЫФІЧНАЕ

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасцей:*
*1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках),*
*1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*1-23 01 14 Сацыяльна-культурная дзейнасць*

2019

Вучэбная праграма складзена на аснове адукацыйнага стандарта вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21-04 01-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 01 Культуралогія (па напрамках) і вучэбных планаў па спецыялізацыям рэг. № Д21-1-70/17 вуч.; Д21-1-69/17 вуч.; Д21-1-71/17 вуч.; Д21-1-73/17 вуч. ад 05.07.2017

**СКЛАДАЛЬНІК:**

*А. І. Смолік,* загадчык кафедры культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар культуралогіі, прафесар

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

*М. М. Сакалоўская*, старшы выкладчык кафедры сацыяльна-гуманітарных дысцыплін установы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі», кандыдат культуралогіі;

*Т.М. Смолікава,* дацэнт кафедры міжкультурных камунікацый установы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат культуралогіі

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

*кафедрай* культуралогіі ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 10 ад 27.03.2019);

*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 17.04.2019)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Адказны за выпуск: *А. І. Смолік*

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Актуальнасць вывучэння міфалогіі як адной з базавых вучэбных дысцыплін у сістэме вышэйшай культуралагічнай адукацыі абумоўлена яе значным патэнцыялам для ўсебакавога развіцця, павышэння агульнай культуры асобы, фарміравання сістэмы каштоўнасцей і ідэалаў гуманістычнага светапогляду. Веданне міфалогіі, якая з’яўляецца ранняй формай духоўнай культуры беларускага і кітайскага этнасаў, забяспечвае эстэтычнае і патрыятычнае выхаванне спецыялістаў сацыякультурнай сферы.

Праграма, створаная на аснове адукацыйнага стандарта, прадугледжвае сістэматызаванае вывучэнне разнастайных тыпаў беларускіх і кітайскіх міфаў, якое неабходна студэнтам для фарміравання цэласнага ўяўлення аб нематэрыяльнай культурнай спадчыне Беларусі і Кітая.

*Мэтай* вучэбнай дысцыпліны «Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае» з’яўляецца набыццё студэнтамі базавых ведаў аб агульных заканамернасцях генезісу культуры, яе ранніх формах і функцыях асаблівасцях яе функцыянавання, канцэптах міфалогіі; спецыфіцы гістарычнага развіцця ў Кітаі і Беларусі, спосабах і праблемах іх узаемадзеяння.

*Задачы*:

– фарміраванне ўяўлення пра сутнасць і развіццё духоўнай культуры, разнастайнасць яе форм і тыпаў;

– атрыманне ведаў аб метадах даследавання міфаў;

– апісанне і супастаўленне розных тыпаў міфаў на падставе выяўлення агульных рыс для вызначэння культуратворчасці міфічныхт персанажаў, вылучэння іх тыпалагічных характарыстык;

– фарміраванне навыкаў самастойнага вывучэння міфаў Кітая і Беларусі;

– далучэнне да сусветнай і нацыянальнай культурнай спадчыны беларусаў і кітайцаў.

Вучэбная дысцыпліна “Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае” прадугледжвае актуалізацыю міжпрадметных сувязей з такімі вучэбнымі дысцыплінамі дзяржаўнага кампанента, як: “Гісторыя Беларусі (у кантэксце сусветных цывілізацый)”, а таксама вучэбнымі дысцыплінамі кампанента УВА: “Усеагульная гісторыя”, “Усеагульная гісторыя мастацтваў”, “Ахова гісторыка-культурнай спадчыны”, “Этналогія і этнаграфія Беларусі” і некаторымі іншымі.

Вучэбная дысцыпліна “Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае” з’яўляецца курсам па выбару студэнтамі спецыяльнасці

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Прыкладная культуралогія для першай ступені вышэйшай культуралагічнай адукацыі.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнт павінен *ведаць:*

– базавыя паняцці і праблематыку дысцыпліны;

– эвалюцыю міфалогіі як феномена культуры;

– важнейшыя метадалагічныя парадыгмы даследавання міфаў;

– заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– асноўныя этапы гісторыі сусветнай і нацыянальнай культуры, заканамернасці іх паслядоўнага развіцця;

– асноўныя дасягненні ў развіцці матэрыяльнай і духоўнай сусветнай культуры у параўнанні з архаічнай эпохай.

*умець:*

– характарызаваць асноўныя этапы ў гісторыі сусветнай, беларускай і кітайскай культуры, заканамернасці іх развіцця;

– ацэньваць стан, тэндэнцыі і перспектывы развіцця міфалогі;

– аналізаваць ва ўзаемасувязі развіццё міфалогіі, рэлігіі, філасофіі, дасягненні навукі і адукцыі;

– ужываць асноўныя паняцці і фактагічны матэрыял міфалогіі ў будучай тэарэтычнай і практычнай дзейнасці;

– вызначаць месца і ролю беларускай і кітайскай міфалогіі ў гісторыі сусветнай культуры.

*валодаць:*

– асноўнымі паняццямі і тэрмінамі спецыяльнай лексікі;

– сучаснымі метадалагічнымі канцэпцыямі ў міфалогіі;

– актуальнымі метадамі і прыёмамі комплекснага аналізу пэўных тэкстаў міфаў.

Вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае» павінна забяспечыць фарміраванне ў студэнтаў наступных *акадэмічных кампетэнцый:*

– АК-1. Валодаць і ўмець выкарыстоўваць базавыя навукова-тэарэтычныя веды у галіне міфалогіі для вырашэння тэарэтычных і практычных задач.

– АК-2. Валодаць сістэмным і параўнальным аналізам.

– АК-3. Валодаць даследчымі навыкамі.

– АК-4. Умець працаваць самастойна.

– АК-5. Быць здольным параджаць новыя ідэі (валодаць крэатыўнасцю).

– АК-6. Валодаць міждысцыплінарыным падыходам да вырашэння праблем.

– АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– АК-9. Умець вучыцца, павышаць сваю кваліфікацыю на працягу ўсяго жыцця.

Студэнт павінен развіць наступныя *сацыяльна-асобасныя кампетэнцыі:*

– САК-1. Валодаць грамадзянскімі якасцямі.

– САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

– САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобаснай камунікацыі.

– САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

– САК-6. Умець працаваць у камандзе.

– САК-7. Умець фарміраваць і абараняць уласныя меркаванні.

Студэнт павінен набыць наступныя *прафесійныя кампетэнцыі:*

– *арганізацыйна-кіраўніцкая дзейнасць:*

– ПК-7. Выкарыстоўваць у прафесійнай дзейнасці найноўшыя інфармацыйныя тэхналогіі;

– *аналітычная дзейнасць:*

– ПК-8. Дыялектычна мысліць і аргументаваць свій пункт погляду, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей, распрацоўваць рашэнні з улікам эканамічных, сацыяльных і этычных патрабаванняў, ацэніваць гістарычныя і сучасныя праблемы і тэндэнцыі, рыхтаваць навуковыя матэрыялы, рэфераты, агляды, рэцэнзіі.

– ПК-10. Прадстаўляць вынікі работы ў выглядзе справаздач, рэфератаў, артыкулаў, якія аформлены згодна з патрабаваннямі і выкананы на падставе сучасных сродкаў рэдагавання і друку;

– *навукова-даследчая дзейнасць:*

– ПК-11. Фармуляваць і вырашаць задачы, якія ўзнікаюць у працэсе навукова-даследчай і педагагічнай дзейнасці і патрабуюць паглыбленых прафесійных ведаў.

– ПК-12. Выбіраць неабходныя метады даследавання, мадыфікаваць існуючыя і распрацоўваць новыя метады згодна з задачамі канкрэтнага даследавання;

– *педагагічная дзейнасць*:

– ПК-13. Творча прымяняць атрыманыя веды і набытыя навыкі ў прафесійнай дзейнасці;

– *інавацыйная дзейнасць:*

– ПК-18. Працаваць з навуковай і метадычнай літаратурай.

Пры вывучэнні дысцыпліны мэтазгодна выкарыстоўваць *метады навучання:* тлумачальна-ілюстратыўны, эўрыстычны, кейс-метад (метад сітуацыйнага аналізу), метад уключанага назірання, вучэбнае мадэляванне практыка-арыентаванага навуковага даследавання.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У рамках фарміравання сучасных сацыяльна-асобасных і сацыяльна-прафесійных кампетэнцый будучых спецыялістаў пры правядзенні семінарскіх заняткаў выкарыстоўваюцца методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны “Міфалогія Кітая і Беларусі: агульнае і спецыфічнае” ўсяго прадугледжана 52 гадзіны, з якіх аўдыторных заняткаў 34 гадзіны для дзённай формы атрымання адукацыі. З іх 24 гадзіны – лекцыі, 10 гадзіны – семінары. Для завочнай формы атрымання адукацыі: 8 гадзін – аўдыторныя заняткі. З іх 6 гадзін – лекцыі, 2 гадзіны – семінары.

Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

### *Тэма 1. Уводзіны. Міфалогія як гістарычна першая форма духоўнай культуры беларускага і кітайскага этнасаў*

Рэміфалагізацыя свядомасці суб'ектаў беларускай і кітайскай культуры ў сучаных умовах жыццядзейнасці. Міфалогія як сістэма поглядаў, заснаваная на іррацыянальным спосабе ўспрыняцця і адлюстравання свету.

Міфалогія як адна з важнейшых форм сэнсажыццёвых пошукаў першапродкаў беларусаў і кітайцаў. Увасабленне ў міфе тыповых, абагульненых, універсальных сэнсаў быцця беларускіх і кітайскіх этнасаў. Адлюстраванне ў міфах з'яў прыроды, яе асваення, сацыяльнага жыцця ў шырокіх мастацкіх абагульненнях.

Міф і абрад як ядро беларускай і кітайскай архаічнай культуры. Міфы – аснова розных жанраў фальклора і форм язычаскай рэлігіі.

### *Тэма 2. Абагульненае адлюстраванне рэчаіснасці ў выглядзе пачуццёвых уяўленняў аб першасных якасцях рэчаў і з'яў прыроды ў міфах беларусаў і кітайцаў*

Міфасінкрэтычная структура мысленне старажытных беларусаў і кітайцаў. Спецыфічныя асаблівасці міфалагічнага светаўспрымання беларускім і кітайскам этнасам. Нерасчлененасць успрыняцця жывой і нежывой прыроды, чалавечага і прыроднага свету, уяўленняў аб тоеснасці рэчаў і людзей у старажытных формах міфічнай свядомасці беларусаў і кітайцаў.

Міф як апісанне макра- і мікракосмоса ў форме аповяда аб узнікненні частак іх элементаў, у выглядзе з'яў і падзей, якія мелі месца ў пэўныя раннія часы.

### *Тэма 3. Сістэмнае і комплекснае даследаванне міфаў у Беларусі і Кітаі*

Агульныя тэарэтыка-метадалагічныя падыходы да даследавання міфа як феномена культуры ў заходнееўрапейскім і расійскім дыскурсе.

Даследаванне міфалогіі, як падмурка нацыянальнай культуры, беларускімі навукоўцамі. Выяўленне ўзаемасувязі міфа і літаратуры ў працах Т. І. Шамякінай, В. А. Каваленка, А. М. Ненадаўца і інш. Інтэрпрэтацыя міфалогіі як крыніцы беларускага фальклора В. А. Василевичам А. Н. Виноградовай. Э.К. Дарашэвічам і інш.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Першапачатковы этап даследавання міфаў кітайскімі вучонымі (Вэнь Ідо, Мао Дунь, Лі Цзеган і інш.).

Даследаванне міфаў на аснове навуковага вывучэння старажытных літаратурных крыніц у 2-й палове XX ст. (Сяо Бінь, Ху Няні, Юань Кэ, Ян Куан і інш.)

### *Тэма 4. Віды беларускай і кітайскай міфалогіі*

Старажытная (дахрысціянская) беларуская міфалогія. Адлюстраванне ў старажытнай міфалогіі працэсаў упарадкавання Сусвету з хаоса, бескампраміснай барацьбы паміж багамі, культурнымі героямі і выключнымі асобамі. Увасабленне ў "нізкай міфалогіі" деманалагічных персанажаў.

Хрысціянская міфалогія беларусаў. Прыстасаванне міфалагічных вобразаў старажытнай міфалогіі у перыяд хрысціянізацыі беларускіх зямель. Пераасэнсаванне старажытных міфаў і ўключэнне перапрацаваных міфалагічных сюжэтаў у хрысціянскія тэксты, рэлігійныя абрады і рытуалы. Выкарыстанне міфалагічнай традыцыі хрысціянствам. Інтэрпрэтацыя асноўных катэгорый хрысціянства праз разнастайныя беларускія міфы.

Старажытнакітайская міфалогія і яе галоўныя персанажы (богі, духі, культурныя героі, першапродкі, міфічныя імператары і інш.).

Канфуцыянская міфалогія як вынік адаптацыі старажытных міфаў да сацыяльна-этычнага вучэння Канфуцыя.

Прысутнасць пераапрацавных старажытных міфаў у даоіасіскай міфалогіі. Спроба даоіасістаў растлумачыць будову свету і з'яў прыроды сродкамі міфалогіі. Уключэнне міфілагічнага матэрыялу ў філасофію даоіасізма.

Фарміраванне сістэмы будыйскай міфалогіі ў Кітаі. Запазычанне персанажаў з індыйскай культуры і злучэнне іх з героямі кітайскай міфалогіі. Позже буддисты стали соединять происхождение своих мифических персонажей с китайскими героями. Дэталізацыя будыстамі ўяўленняў аб падземным свеце і пякельных судзілішчах.

### *Тэма 5. Тыпалогія беларускіх і кітайскіх міфаў*

Архаічныя міфы як форма паданняў. Іерархія беларускіх і кітайскіх міфаў.

Касмалагічныя міфы як аповяды пра стватэнне Сусвету.

Акумуліраванне пазітыўнай дзейнасці чалавека і ідэалізацыя культуратворчасці першапродкаў беларусаў і кітайцаў у гераічных міфах.

Тлумачэнне паходжання чалавека і першых сацыяльных супольнасцей ад татэмных жывёл і іншых арганічных істот і неарганічных рэчываў у антрапаганічных міфах.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Аповяды аб падзеях далёкага і блізкага мінулага, аб “апошніх” рэчах і гібелі свету ў эсхаталагічных міфах.

Цыклы каляндарных абрадаў, багі, духі, магія ў каляндарных міфах.

### *Тэма 6. Касмагонія і эсхаталогія і яе ўвасабленне ў міфах Беларусі і Кітая*

Касмагонія – важнейшая частка міфатворчасці беларусаў і кітайцаў.

Пытанні ўзнікнення Сусвету, Зямлі, Неба, расліннага, жывельнага свету і чалавека ў беларускай і кітайскай міфалогіі. Касмаганічныя сюжэты ў хрысціянскай міфалогіі.

Род, Сотвар, Жажбог і Пярун как героі-деміургі, якія стварылі Сусвет с верхнім, сярэднім і ніжнімі мірамі. Регулятыўная і адаптацыйная функцыя ў стварэнні Зямлі міфалагічнага пресанажа Бая.

Тянь (Неба) – вярхоўны дух кітайскай міфалогіі, які стварыў усё існае. Узнікненне элементаў матэрыяльнага свету з духа і цела Паньгу.

Эсхаталагічныя міфы беларусаў і кітайцаў. Змаганне з патопам Гуня і Юя. Выратаванне Ноям чалавечага рода, жывельнага і расліннага відаў. Міфы аб пекле і діюе ў беларускай і кітайскай міфалогіі.

### *Тэма 7. Антрапаганічныя і гераічныя міфы беларускага і кітайскага этнасаў*

Чалавек як вынік трансфармацыі татэмных жывёл. Мядведзь – татэм першапродкаў кітайцаў і беларусаў.

Даждбог, Род, Бай – родапачынальнікі беларускага этнаса. Міф аб Гаршэчніцы. Інтэрпрэтацыя праблемы з’яўлення першага чалавека ў хрысціянскай міфалогіі.

Нюйва і Паньгу як творцы першапродкаў кітайцаў.

Трансляцыя культурнымі героямі артэфактаў культуры беларусаў і кітайцаў. Асноўныя культурныя героі беларускай і кітайскай міфалогіі.

### *Тэма 8. Міфалагічныя персанажы беларусаў і кітайцаў як першастваральнікі артефактаў матэрыяльнай і духоўнай культуры*

Герой-дзяміург Бай – заснавальнік паляўніцтва на беларускіх землях. Апякунства міфічным персанажам Зосімам бортніцтва. Міфалагізацыя земляробства першапродкамі беларусаў. Богі і духі земляробства (Бялун, Жыцень, Палявік, Талака і інш.). Аўлас, Вазіла, Вялес, Хлеўнік – апякуны жывёлагадоўлі.

Ганчар, Дзямьян, Кузьма і Лаўр – першыя міфалагічныя рамеснікі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзейнасць міфічных персанажаў па вытворчасці прылад працы (Лу Бань, Сяо Гунь, Хуан-ді і інш.). Вынаходніцтва культурнымі героямі прыстасаванняў для палявання і лоўлі рыбы (Фусі, І. Хоуі, Шу і інш.). Культурныя героі як заснавальнікі земляробства (Гуйгу-цзы, Тай-сі, Хоу-цзы, Цай-шэнь, Шэнь-нун і інш.).

Заснаванне міфічнымі персанажамі рамёсел і промыслаў (Дунфан Шо, Жу-Шоу, Іцзюнь, Хуан-ді, Чы-ю і інш.).

### *Тэма 9. Міфілагічныя вытокі беларускай і кітайскай славеснай творчасці*

Персанажы беларускіх міфаў як заснавальнікі пісьменнасці і славеснай творчасці (Баян, Еўфрасіня Полацкая, Ізяслаў, Кірыла і Мяфодзій). Міфічныя летапісцы і іх творы: “Полацкі летапіс”,”Аўраамсккі летапіс”, “Летапісец вялікіх князёў літоўскіх” і інш. Агіяграфічная літаратура Старажытнай Беларусі. Эпіграфікі.

Вынаходніцтва пісьменнасці культурнымі героямі ў Старажытным Кітаі (Вэнічан, Мэн Тянь, Фусі, Цанцзе і інш.).

Першыя старажытныя творы і іх міфічныя аўтары: “Вёсны і Восені Люя”, Лагаграфіі (“Тао-у”, ““Шан шу”, “Чун-цю”, “Кніга гор і мораў” і інш.). “Шы-цзы” (“Гістарычныя запіскі”) Сыма Цяна. “Шыцзін” (“Кніга песен і гімнаў”) – класічны канон старажытнай літаратуры Кітая. Міфічныя персанажы каля вытокаў кітайскай паэзіі: Сун Юй, Сыма-Сян-жу, Цюй Юань.

### *Тэма 10. Вобраз музыканта ў беларускай і китайскай міфалогіі*

Сінкрэтычны характар старажытнага беларускага і кітайскага мастацтваў.

Міфалагема *музыканта* як культурнага героя у вуснай народнай творчасці беларусаў. Вобраз музыкі ў беларускіх міфілагічных казках “Музыка і чэрці”, “Цыган-музыка”,”Гуслі”, “Шчаслівы пастух”, “Пятніца” і інш.

Дачыненне культурных герояў (Дзі-ку, Нюйва, Хуан-дзі, Ю-Шуй і інш. ) да вырабу першых музычных інструментаў (барабана, гуслі, лютня, флейта, цытра, шэнхуан і інш).

Разнастайнасць жанраў музычнага мастацтва ў архаічную эпоху. Стварэнне міфічнымі персанажамі першых вакальных і інструментальных твораў (Гу Соу, Куй, Удай Юаньшуй, Чжы і інш.).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

### *Тэма 11. Міфы и абрады як крыніца беларускага і кітайскага тэатральнага мастацтва*

Элементы музычна-сцэнічных відовішч у культавых абрадавых формах беларусаў і кітайцаў. Звязаныя і пераплеценыя паміж сабой міф і абрад як ядро архаічнай духоўнай культуры беларусаў. Выкарыстанне абрадам мовы міфа. Арадавыя містэрыі-шэсці і іх тлумачэнні ў міфах. Перадача метамоўнай семантыкі рознымі мастацкімісродкамі. Структура і мова абрада ў беларускіх і кітайскіх міфах Міфы Кітая і Беларусі як своеасаблівая тэатральная інсцэніроўка міфічных сюжэтаў.

Міфалагічныя карані старажытнабеларускага тэатральнага мастацтва. Міфы іа абрады як передумовы народнага тэатра беларусаў. Абрады ў гонар міфічных персанажаў Лёлі, Пяруна, Талакі, Ярылы і інш.

Сюжэты і вобразы беларускай міфалогіі ў відовішчных рытуалах падчас каляндарных святаў Дзяды, Купалле, Каляды, Маслянка і інш. Узнаўленне персанажаў міфалагічнага свету у каляндарных містэрыях.

### *Тэма 12. Міфалагічныя асновы беларускага і кітайскага харэаграфічнага мастацтва*

Рытуальныя танцы і пантамімы, заснаваныя на імітацыі татэмаў беларусаў і кітайцаў. Рытуальныя танцы першапродкаў кітайцаў падчас храмавых абрадаў і ваенных дзеянняў. Каляндарныя танцы. Магічны характар танцаў.

Рэлігіная і містычная сутнасць архаічных танцаў. Адлюстраванне ў танцах рэгіянальных асаблівасцей кітайскіх этнасаў.

Танец як сродак пераадолення фізічных і псіхічных адхіленняў у старажытных кітайцаў. Міфічныя культурныя героі, якія маюць дачыненне да ўзнікнення танцавальнай культуры.

Сувязь беларускага народнага танца з міфамі і абрадамі. Калектыўныя танцы беларусаў у гонар багіні вясны Лёлі, лета – Талакі. Сувязь танца зрэліктавай прадуктыўнай магіяй.

Карагод як старажытны жанр фальклорна-гульнявой і абрадавай сферы традыцыйнай культуры беларусаў. Сінкрэтычны характар народнага танца беларусаў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

| Назва тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | Колькасць гадзін КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | Лекцыі | Семінарскія заняткі | | |
| **Тэма 1.** Уводзіны. Міфалогія як гістарычна першая форма духоўнай культуры беларускага і кітайскага этнасаў | 2 | | | |
| **Тэма 2.** Абагульненае адлюстраванне рэчаіснасці ў выглядзе пачуццёвых уяўленняў аб першасных якасцях рэчаў і з'яў прыроды ў міфах беларусаў і кітайцаў | 1 | | | |
| **Тэма 3.** Сістэмнае і комплекснае даследаванне міфаў у Беларусі і Кітаі | 1 | | | |
| **Тэма 4.** Віды беларускай і кітайскай міфалогіі | 1 | 1 | 2 | Праверка прэзента-цый |
| **Тэма 5.** Тыпалогія беларускіх і кітайскіх міфаў | 1 | 1 | | |
| **Тэма 6.** Касмагонія і эсхаталогія і яе ўвасабленне ў міфах Беларусі і Кітая | 2 | 1 | | |
| **Тэма 7.** Антрапаганічныя і гераічныя міфы беларускага і кітайскага этнасаў | 2 | 1 | | |
| **Тэма 8.** Міфалагічныя персанажы беларусаў і кітайцаў як першастваральнікі артефактаў матэрыяльнай і духоўнай культуры | 2 | | 2 | Індывіду-альныя заданні |
| **Тэма 9.** Міфілагічныя вытокі беларускай і кітайскай славеснай творчасці | 2 | 1 | | |
| **Тэма 10.** Вобраз музыканта ў беларускай і китайскай міфалогіі | 2 | 1 | | |
| **Тэма 11.** Міфы и абрады як крыніца беларускага і кітайскага тэатральнага мастацтва | 2 | 1 | | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| **Тэма 12.** Міфалагічныя асновы беларускага і кітайскага харэаграфічнага мастацтва | 2 | 1 | 2 | Калоквіум |
| **Разам…** | **20** | **8** | **6** | |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Літаратура

*Асноўная*

1. Барт, Р. Мифология / Р. Барт // Избранные работы: Семиотика. Поэтика : пер. с фр. / Р. Барт ; сост., общ. ред. и вступ. ст. Г. К. Косикова. – М. : Издательская группа «Прогресс», «Универс», 1994. – С. 48–130.

2. Беларуская міфалогія : Энцыклапед. слоўн. / . С. Санько [і інш.] ; склад. І. Клімковіч. – 2-е выд., дап. – Мінск : Беларусь, 2006. – 599 с.

3. Духовная культура Китая: энциклопедия: в 5 т. / гл. ред. М. Л. Титаренко; Ин-т Дальнего Востока РАН – М.: Вост. лит. – [Т. 2:] Мифология. Религия / ред. М. Л. Токарев и др. – 2-е изд. стереотипное. – 2011. – 869 с.: ил.

4. Китайская мифология: Энциклопедия / [Сост., общ. ред., предисл. К. Королева].— М.: Эксмо; СПб.: Мидгард, 2007. – 416 с.

5. Клакхон, К. Мифы и обряды: общая теория / К. Клакхон // Обрядовая теория мифа : сб. науч. ст. / сост., пер. А. Ю. Рахманина. – СПБ : АО «Норинт», 2003. – С. 157–176.

6. Лосев, А. Ф. Диалектика мифа / А. Ф. Лосев // Миф. Число. Сущность / А. Ф. Лосев ; сост. А. А. Тахо-Годи ; общ. ред. А. А. Тахо-Годи, И. И. Маханькова. – М. : Наука, 1994. – С. 5 – 217.

7. Лю, Янь. Персонаж белорусской и китайской мифологии как первотворец и транслятор артефактов культуры : сравнительно-типологический аспект /Янь Лю. – Минск: А.Н. Вараксин, 2018 – 256 с.

8. Міфалогія беларусаў : энцыкл. слоўн. / склад.: І. Клімковіч, В. Аўтушка ; навук. рэд.: Т. Валодзіна, С. Санько. – Мінск : Беларусь, 2011. – 605 с.

9. Мифология : ил. энцикл. слов. / гл. ред. Е. М. Мелетинский. – СПб.: Фонд «Ленингр. галерея» : Норинт, 1996. – 843 с.

10. Ненадавец, А. М. / А. М. Ненадавец. Нарысы беларускай міфалогіі – Мінск : Беларус. навука, 2013. – 535 с.

11. Смолик, А. И. «Исторические записки» Сыма Цяна как источник по древнекитайской цивилизации / А. И, Смолик // Пути Поднебесной: сб. науч. тр. Вып. YI. В 2 ч. Ч. I. – Минск : РИВШ, 2017. – С. 273. – 280.

12. Шамякіна, Т. І. Міфалогія Беларусі: нарысы: вучэб. дапам. / Т. І. Шамякіна. – Мінск : Маст. літ., 2000. – 398 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

13. Юань Кэ. Мифы Древнего Китая / Юань Кэ; пер. с кит.: Е. И. Лубо-Лесниченко [и др.]; отв. ред. Б. Л. Рифтин. – 2-е изд., испр. и доп. – М.: Наука, 1987. – 526 с.

*Дадатковая*

1. Буслаев, Ф. И. Народный эпос и мифология / Ф. И. Буслаев ; сост., авт. вступ. ст. и коммент. С. Н. Азбелев. – М. : Высш. шк., 2003. – 398 с.

2. Вундт, В. Миф и религия / В.Вундт // Мюллер, М. От слова к вере / М. Мюллер. Миф и религия / В. Вундт. – М.:, СПб. : Фонд «Ленинградская галерея», 2002. – С. 245 – 827.

3. Калацэй, В. В. Параўнальная міфалогія / В. В. Калацэй. – Мінск : Зорны верасень, Паркус плюс, 2009. – 116 с.

4. Мартысюк, П. Г. Мифосемантические основания циклической парадигмы культуры / П. Г. Мартысюк. – Минск : Адукацыя і выхаванне, 2014. – 255 с.

5. Мелетинский, Е. М. Поэтика мифа / Е. М. Мелетинский. – 4-е изд., репр. – М. : Вост. лит., 2006. – 406 с.

6. Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С.А.Токарев. – 2-е изд. – М. : Совет. энцикл., 1987–1988. – Т. 1. – 1987. – 671 с.

7. Мифы народов мира : энциклопедия : в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – 2-е изд. – М. : Совет. энцикл., 1987–1988. – Т. 2. – 1988. – 719 с.

8. Рифтин, Б.Л. От мифа к роману: эволюция изображения персонажа в китайской литературе / Б. Л. Рифтин. – М. : Наука, 1979. – 360 с.

9. Элиаде, М. Аспекты мифа / М.Элиаде; пер. с фр. В. Большакова; ст., коммент. Е. Строгановой. – М.: Инвест-ППП, 1996. – 240 с.

10. Яншина, Э. М. Формирование и развитие древнекитайской мифологии / Э. М. Яншина. – М.: Наука, 1984. – 248 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метады (тэхналогіі) навучання

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння задач, адносяцца:

– тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;

– тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;

– праектныя тэхналогіі;

– камунікатыўныя тэхналогіі (дыскусіі, прэс-канферэнцыі, вучэбныя дэбаты і іншыя актыўныя формы і метады);

– метад аналізу канкрэтных сітуацый;

– гульнявыя тэхналогіі, у межах якіх студэнты ўдзельнічаюць у дзелавых, ролевых, імітацыйных гульнях, і інш.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна-ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання сучаснай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнцыі выпускніка ВНУ ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Сродкі дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці

Да эфектыўных педагагічных методык і тэхналогій, якія садзейнічаюць далучэнню студэнтаў да пошуку і выкарыстання ведаў, набыццю вопыту самастойнага вырашэння праблем сацыякультурнай практыкі, адносяцца:

- тэхналогіі праблемна-модульнага навучання;
- тэхналогіі вучэбна-даследчай дзейнасці;
- праектныя тэхналогіі;
- камунікатыўныя тэхналогіі;
- гульнявыя тэхналогіі;
- метад аналізу канкрэтных сітуацый.

Для кіравання вучэбным працэсам і арганізацыі кантрольна- ацэначнай дзейнасці выкладчыкам рэкамендуецца выкарыстоўваць рэйтынгавыя, крэдытна-модульныя сістэмы ацэнкі вучэбнай і даследчай дзейнасці студэнтаў, варыятыўныя мадэлі кіруемай самастойнай працы, вучэбна-метадычныя комплексы.

У мэтах фарміравання неабходнай сацыяльна-асобаснай і сацыяльна-прафесійнай кампетэнтнасці выпускніка УВА ў практыку правядзення семінарскіх заняткаў мэтазгодна ўкараняць методыкі актыўнага навучання, дыскусійныя формы.

У якасці аднаго з элементаў выяўлення вучэбных дасягненняў студэнта магчыма выкарыстоўваць крытэрыяльна-арыентаваныя тэсты. Яны ўяўляюць сабой сукупнасць тэставых заданняў закрытай формы з адным альбо некалькімі варыянтамі правільных адказаў; заданняў на ўстанаўленне адпаведнасці паміж элементамі двух варыянтаў з адным альбо некалькімі суадносінамі і роўнай альбо рознай колькасцю элементаў і варыянтаў; заданняў адкрытай формы з фармалізаваным адказам; заданняў на ўстанаўленне правільнай паслядоўнасці.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ